Яўген Зялкоўскі

# Узоры жыцця



Мінскае абласное аддзяленне
Саюза пісьменнікаў Беларусі

Яўген ЗЯЛКОЎСКІ

# УЗОРЫ ЖЫЦЦЯ

вершы

2024

Электронная бібліятэка
Мінскага абласнога аддзялення
Саюза пісьменнікаў Беларусі

*Серыя заснавана ў 2023 годзе*

Пад рэдакцыяй Р. Ю. Малахоўскага

№ 013

**Зялкоўскі Я.Ф.**
Узоры жыцця : вершы / Яўген Зялкоўскі. — Мінск : МАА СПБ, 2024. — 50 с. (Электронная бібліятэка).

© Зялкоўскі Я.Ф., 2024
© Падрыхтоўка, афармленне.
ГА “Мінскае абласное аддзяленне
Саюза пісьменнікаў Беларусі”, 2024

## РАДЗІМА НЕЎМІРУЧАЯ

Краіна Беларусь цудоўная:
Азёрамі, лясамі поўная.
Чаруе квецень нас яе вясны,
Зрок радуе калоссе збажыны.

Радзіма наша – неўміручая,
Свабодная, жыццём кіпучая.
Яе ўжо не пазбавяць каранёў
Ні ворагі, ні здрада халуёў.

Усё, што мае край наш з даўніны,
Уратаванае яно не без вайны.
Не хочам мець зласлівых мы сяброў,
Браць падарункаў з таямнічых слоў.

А нехта хлеб чужы маўчком грабе.
Мы ўсё ствараем самі для сябе.
Цяжар жыцця прывыклі валакчы,
І пільнасць вечна ў сэрцах берагчы.

І мова наша загучыць, як звон,
І назаўсёды скіне хворы сон.
Надзейны лекар – гэта добры час,
Жаданне шчырае мацуе нас.

**БЕЛАРУСЬ**

Беларусь радзімая
У нябыт не канута.
Для ўсіх нас любімая.
Здрадай не падманута.

Зіхаціць азёрамі,
Рэкамі спавітая.
Не схавана горамі.
Да нябёс адкрытая.

Беларусы ветлыя
Вельмі працавітыя.
Іх жаданні светлыя.
Душы іх адкрытыя.

Дабраце навучаны.
Маюць што: падзеляцца.
З гаркатой разлучаны.
Цёплым словам хмеляцца.

**РАДЗІМА**

О маці Беларусь мая!
Прытулак мой, жыццё і лёс.
Без колераў краса твая,
Слязінкі на лістах бяроз.
Глумілі ворагі край твой,
Арэнаю была баёў.
Зрывалі бруднаю рукой
Цвет васільковы, рунь палёў.
Сумуюць нівы і бары,
Гучыць не родны гоман, спеў.
Ад хмар плывучых з-за мяжы
Твой купал неба пахмурнеў.
Журба ў вачах не растае,
Жывём у беднай мітусні.
Не ўсе байцы сыны твае,
Бо нехта страціў карані.
О маці Беларусь, жыві
Дыханнем глыбіні азёр!
Ты ў сэрцах нашых, у крыві.
Будзь самай яркаю між зор!

**ПАРОГ БАЦЬКОЎСКІ**

О, любы кут мой Мілашы.
І сад, і шумны гурт кляновы!
Вы – песня для самой душы
Парой вясенняй і зімовай.
Бабуля тут да маразоў
Цярпліва басанож хадзіла.
Мяне ў прыполе каласоў
Жняя пад сонцам нарадзіла.
Тут над калыскаю маёй
Спявала маці калыханку.
Круціла калаўрот нагой,
Кудзелю прала аж да ранку.
Тут прадзед мой усю вясну
Хадзіў пануры за сахою
І сеяў жменяй збажыну.
Цапамі малаціў зімою.
Тут з карасямі ёсць і стаў,
Купаюцца ў ім ноччу зоркі.
Рыдлёўкай дзед яго капаў.
Далонню выціраш пот горкі.

О, родны кут мой Мілашы!
Уцеха й боль маёй душы!
Не забывай
Што знайшоў у вяках –
Беражы, не губляй!
Да слязіны ў вачах
Палюбі родны край.
І ніколі нідзе
Не забудзься, хто ты,
Толькі вернасць вядзе
У край роднай красы.

Дзе твой дом, там ты цар,
Там і царства тваё.
Там ты раб, гаспадар
І з табой сваяўство.
Ты не грэбуй нічым,
Што ўжылося ў крыві,
Не хваліся чужым
Спевам, свой не гняві.
І не згубішся ты
У засценках чужых.
Не сатруцца сляды
Спраў свяшчэнных зямных.

## МАТЧЫНА ВОЛЯ

Трымаюць крону карані
Хіба мне да спакою,
Хіба мне да спачыну?
Не, не выйду са строю
Змагароў за Айчыну!
Я жыву па загаду
Добрай матчынай волі.
Не ўшаную я здраду
Беларусі ніколі!
Зберагу для нашчадкаў
Дар Радзімы бясцэнны
Без развагаў, падказкаў –
Гэта доўг мой свяшчэнны!

## ДЗЕ ТАК ВОЛЬНА

Як збіраюся яў госці,
Дык наладжваю настрой.
Кідаю з гасцінцаў штосьці
У мяшок, бяру з сабой.

Набіраюся цярпення,
Шчырасць дык бяру ў запас,
Каб знайсці паразуменне,
Стрэчы не азмрочыць час.

Цяжка ад мясціны роднай
Адысці, час скаратаць,
Дзе так працы шмат свабоднай,
Дзе так вольна жыць, ствараць.

## ДАРАГОЕ

Край, табе дарагі,
З векапомнай вясной.
У свае берагі
Час вяртае ізноў.
Ты люляла дзіця,
Шліфавала радкі,
Быў на дрэве жыцця
Ліст такі шапаткі.
Як натхненне гарыць,
Загараецца й кроў.
Хоць напой і стары
Хмеліць радасна зноў.
Тчэцца мудры сувой,
Кветак шмат зацвіло.
Не відаць за слязой,
Што за песняй было.

**БЯРОЗЫ**

Адышлі ліхалецці,
Адгрымелі ўраганы.
Залячылі бярозы
Свае даўнія раны.
Ля старых узняліся
Маладзенькія кроны.
Зноў спяваюць бярозы
Міла ў хоры зялёным.
Беларусь старажытная
Мы сыны і патрыёты
Роднае зямлі бацькоў.
І яе здабыткі поту
Нам дасталіся з вякоў.
Мы не здраднікаў унукі.
Мужныя былі дзяды.
Не працягнем ветла рукі,
У каго з крывёй сляды.
Нам абдымкі не патрэбны
Тых прыяцеляў з радні,
У каго намер ганебны:
Вырваць нашы карані.
Не натоўп мы і не племя:
Мы дзяржава і народ.
Хто знішчае роду семя –
Быдла той, бадзягаў зброд.
Беларус жа не рабыня,
Здрадніцаю не была,
І народ сябе не кіне
На імперскі сметнік зла!

**БЕЛАРУСЫ**

Любіць свет вас, беларусы!
Бо гасцінны вы народ.
Вас не вабіць звон спакусы,
Вам патрэбны рух, палёт.
Беларусы, беларусы,
Вамі пройдзены вякі.
Голас мілы, волас русы.
Вы для ўсіх бы сваякі.
Праца грэе вас і грэла
З раніцы, так дзень пры дні.
Рух такі гартуе цела.
Там, дзе вы, шмат цеплыні.
Вы не пакідалі строю
У змаганні й басанож,
Елі шчаўе з крапівою,
Паліваў нягодаў дождж.
Скінуты з вякоў тых маскі.
Жахі помняцца, іх сны.
Не зманы вы і не з казкі –
Беларусі вы сыны!

**МОВА РОДНАЯ**

Лёгка размаўляць на мове
роднай, пець таксама.
Ласкі шмат у кожным слове,
мілы воклік “мама”!
Мова наша сталасць мае:
створана вякамі.
Нашу годнасць узнімае
за сталом з пасламі.
Выжыць трэба з сэрца здраду
і напеў чужыны.
Па Радзімы жыць загаду:
светач ён адзіны.
Краю роднага прырода
дар свій не знішчае.
Мова родная народа
волю зберагае.
Не зацiхне аніколі
голас мовы весні.
Будзе жыць на сцэне, ў полі,
у баі і ў пнсні.
Дык палюбім мову гэтак
моцна, як і маці.
Хай звініць яна і ўдзетак
на двары іў хаце.

## БЕЛАРУСЬ ПАРТЫЗАНСКАЯ

Цёмныя ночы, паходы, трывогі,
Сцежкі крутыя лясоў і балот…
Час той ваенны, суровы і строгі,
Зведаў увесь беларускі народ.
Пушчы, зямлянкі людзей сагравалі,
Клікаў на подзвіг Радзімы набат.
Мсціўцы фашыстам куль не шкадавалі.
Помста была не без болю і страт.
Ворага йшлі пад адхон эшалоны,
Рэйкі са шпал гнеў народны зрываў.
Зырка гарэлі са зброяй вагоны,
Полымя бляск перамогай лунаў.
Дым крэматорыяў цешыў фашыстаў.
Толькі іх смерць абарвала разбой.
Сцяг над Рэйхстагам узвіўся ўрачысты.
Дзень перамогі злучыўся з вясной.

## МАЛАДЫМ УДОВАМ

Лёс ваш быў суровы,
Трохі ў шчасце верце.
Прыйдзе час мядовы,
Пакахаюць сэрцы.
Прыгажосць не трацце,
Выглядайце міла.
Гэта шмат багацця,
Гэта ваша сіла.
Згладжвайце маршчынкі,
Шчокі чырваніце.
Радасці іскрынкі
Ў слёзах не тапіце.
Вусны пасалодзяць
Пацалункі шчыра.
У душы наролдзяць
Новага куміра.

## САЛДАТ

Пачатак мужнасці – казарма,
Дзе часта сніцца родны дом.
Тут слава не даецца дарма,
Тут духу воіна пад’ём.
Ты прысягнуў, бо ёсць жаданне
Айчыне вернасцю служыць.
Высокае салдата званне
На палігоне заслужыць.
Найбольшы гонар для салдата –
Ахоўваць пільна рубяжы.
Наказ Радзімы помніць свята,
Яе свабоду берагчы.

## СКАЗ ПРА ДОРЫ

З самага ранку напалі фашысты.
Вёска акружана, плач дзетвары.
Кулі свідруюць паветра са свістам,
Чыняцца здзекі на кожным двары.
Гоняць нявінных людзей з родных хатаў,
Гоняць на смерць, ды на люту яшчэ.
Піць, захапляцца так прагнуць вар'яты
Цёплай крывёю, што з ранаў цячэ…
…Вось ля царквы прыпыніўся начальнік.
Дзверы прастрэліў і выдзер замок.
Тут іх сасмажым! – зароў зверам карнік. –
Ганс, каб ніводзін з "бандытаў" не ўцёк!
Мужна трымалася бедная маці
З дзіцем, прыліплым да родных грудзей.
Прыйдзецца пекла і вам паспытаці,
Не, не спаліць вам сумленных людзей!
Выскаліў кат пачарнелыя зубы,
Штыкам дзіця пракалоць парашыў.
Маці ў адчаі: – Сыночак мой любы,
Годзік адзін ты на свеце пажыў!
Цёмна зрабілася кату, што ўночы,
Грымнуўся ён у агонь праз парог.
Выдрала маці савіныя вочы,
Свету каб бачыць ён болей не мог.

## АЎТАМАТЫ НА ГРУДЗЯХ

У дзесяць гадоў сустрэў я вайну.
Напалі фашыстаў салдаты.
Не мог зразумець я іх гаргатню.
Былі ля грудзей аўтаматы.

Не меў я спакою ні ноччу ні днём.
Трывога пужала да смерці.
Нярэдка рабіўся чужым родны дом.
Дзе ж ноч начаваць, што паесці?

Пагроза жыццю не знікала зусім.
Яно бы на нітцы вісела.
Фашысты гатовілі здзекі ж усім.
Палілі жывучае цела.

Я ўсё ж не загінуў, прыкметна падрос,
І помста душу акрыліла.
Патроны і звесткі... Заўжды ў лагер нёс.
Мацнелі жаданне і сіла.

І вось после бою спаткаў я салдат.
Тушонкай мяне накармілі.
Пад’еўшы, я ў іх папрасіў аўтамат.
Іх словы мае не здзівілі.

Я ім патлумачыў, што быў сувязны,
З варожай навалай змагаўся.
Я помсціў фашыстам, зародкам вайны.
Адзін жа я ў хаце застаўся.

Танкісты забралі з сабою мяне
І стаў я сапраўдным салдатам...

## НАПЕВЫ ЖАНЧЫНЕ

*Прысвячаю Лене Зялкоўскай*

Дзень слаўны Восьмага сакавіка –
Ён урачысты для Айчыны, нас.
Вясны пачатак ён для Жаўрука,
А для Жанчыны ён – святочны час.

Яна, як кветка весняя Зямлі,
Стварае прыгажосць там, дзе жыве.
Ёй пакланяюцца і каралі.
Народжаных у светлы дзень вядзе.

Яна ўздымае веснавы настрой
І ў непагадзь, і ў лютыя вятры,
Не падае, не робіцца другой,
Адводзіць сон прэч на зары.

Для подзвігаў народжана яна:
Зрабіла ў космас баявы палёт.
І мара збудзецца яшчэ адна:
На Марсе наш расплодзіцца народ.

Жанчына ўмее крыўду даравац
І горкага не ўзбудзіць пачуцця.
Яна шчаслівая матуляй стаць
І быць крыніцай новага жыцця.

## ГАДЫ БЯГУЦЬ

*Прысвячаю Уладзіміру Данчанку*
*да дня 50-годдзя*

Вырас мамін сынок.
Разлучыў родных час.
Прыляцеў сын здалёк
Да чужых яму нас.

Хлопец лёс свой не знаў:
Стрэне пекла ці рай?
Для яго мілым стаў
Беларускі наш край.

Мае дом ён, сям’ю,
Мае верных сяброў,
Беларуску сваю
Любіць, родных сыноў.

Ён з юначых гадоў
Ажыўляе спакой,
Песняй з ветлівых слоў
Узнімае настрой.

Пажадаем яму
Так, як сябру свайму,
Адчуваць кожны дзень
Шчасця цёплы прамень!

**МЫ СЛАВІМ ВАС, ГАЗАВІКІ!**

Знайсці сумелі людзі газ
У глыбіні зямных слаёў.
Рэч незаменная для нас
І вартая хвалебных слоў.

Яго блакітнае святло
Зыходзіць з моцнага агню.
Ён саграе спакой, жытло
І прыбаўляе шчасця дню.

На газе варым мы яду,
І здобу ўсякую пячом,
Змяншаем працу і бяду.
Праходзяць ночы з цёплым сном.

Знаходцы рады мы любой,
Людзям удзячны баявым,
Якія з шчыраю душой
Паслугі робяць нам жывым.

Мы славім вас, газавікі!
Вы ў працы пільныя заўжды.
На волі газ жа не такі –
Прынесці можа шмат бяды.

## ВАЛЯНЦІНА

*Памяці паэтэсы*
*В. Ф. Гіруць-Русакевіч,*
*кіраўніцы літатурнага*
*аб’яднання «Рунь»*

Квітнела «Рунь», рос талент малады,
І вырасла шмат творчасці пладоў.
Натхняла Валянціна нас заўжды.
Паэзія душу ўзнімала зноў.

На жаль, жыццё яе лёс скараціў.
Святыя прынялі душу яе.
З красой Зямною, з Сонцам разлучыў.
Ох, як любові ейнай не стае!

Часцінкай сэрцаў нашых жа была.
Край родны памагала нам любіць.
Натхненнем творчасці сваёй жыла,
І зоркаю імкнулася свяціць.

І адгукацца будзе ейная душа
У творах, створаных сваім цяплом.
Не стане скачвацца з вачэй сляза,
Нашчадкаў будзе саграваецца дом.

І будзе радаваць нас творчы плён.
Жыць Валянціне ў памяці людской!
Не змоўкне ейны ручаіны звон.
«Рунь» будзе наша заўжды маладой.

## БЫЛО І СВЯТА

*А.І. Рафаловічу*

Буслы луналі над шчаслівай хатай.
У ёй матуля сына калыхала…
І вырас шчырым ён. Было і Свята:
Радзіма зюбілеем віншавала.

А гэты час і светлы, і гасцінны.
Так помняцца знаёмствы і сустрэчы!
Душу хмяліць святочны водар вінны.
І нехта радуецца ў дзень той нечым.

Заслугі мае сын, каб ганарыцца.
Яго ацэняць працу пакаленні.
І з вышыні яму ўжо не зваліцца:
Трымае моцна ўласнае сумленне.

## БЫЛЫМ НАСТАЎНІКАМ

*Я.Ф. Чаплінскай*
*з нагоды яе 90-годдзя*

Лёс кожнага дзіцяці
Настаўніка кранае.
Ён гэтак, як імаці
І вучыць, натхняе…
Званок у сне ўсё звоніць:
Вядзе душу ў былое.
І цяжка, каб не ўспомніць
Цудоўнае й ліхое.
Запамятаць не можна
Шчаслівы вучняў гоман.
І нечым цешыць кожны
Той даўні школьны момант.

## ЖАНЧЫНАМ

Прыміце, любыя жанчыны,
Пачуццяў кветкі з рук маіх.
Усмешкі вашы для мужчыны –
Бы ззянне зорак веснавых.
Дзе вы, там хораша заўсёды,
Святочна нават на душы.
Хай судзіць грэшных нас прырода,
А хочацца тіак саграшыць.
Так цягне сэрцам прыхіліцца,
Каб спапяляў агонь вачэй.
Усім хачу вам пакланіцца
І хоць адну абняць яшчэ.

## ВОСЕНЬСКІ МАТЫЎ

*Марыі Іванаўне Рафаловіч*

Туман пакрываць стаў уранку даліны,
Духмяным налівам запахлі сады,
Агучваў нябёсы ўжо шнур жураўліны,
А ў хаце старэнькай радзілася ты.
Табе калыханку тут маці спявала,
І колькі было тых бяссонных начэй!
Любоў і трывогу ў душы памнажала,
Сябе шанавала ўсё менш і радзей.
А ты падрастала і ўсё прыгажэла…
Прыемна ўсміхалася хлопцам не раз.
Надзею на любага шчасную мела:
Каханне табе падарыў на ўвесь час.
Крыніцаю поўнай цяпло выцякае
З твайго вечна добрага сэрца для ўсіх,
Твой розум сустрэчц з людзьмі асвятляе,
І помніцца многа часін дарагіх.
Прыходзяць сябры, з днём народзін віншуюць,
І кожны з адкрытай, святочнай душой.
Прыгожыя песні і рэчы даруюць.
І ў кветкі асенняй цудозны настрой.

## ЖАНЧЫНА ЗАСЛУГОЎВАЕ ЛЮБОЎ

*Таццяне Сяргееўне Бобрык*

Нішто не можа затрымаць жанчыну,
Блукае вечна ў пошуку красы.
Зірне ў люстэрку, ўсцешыцца хвіліну,
Падновіць твару выгляд, валасы.

І што яе ўжо толькі не хвалюе?
Які маркотлівы яе спачын!
Яна і ў сне дзіцячы вокліч чуе,
Дарадчыца найпершая ў мужчын.

Быць грубым – гэта ганьба для мужчыны:
Жанчына заслугоўвае любоў.
Не будзе для разладу і прычыны,
Калі багата ў мужа добрых слоў.

## ОДА ЖАНЧЫНЕ

*Г.К. Петуховай*

Ты сыграеш усмешкай пры сустрэчы
Прахожых шчыра, як цяплом вясна.
І сэрца напаўняеш светлым нечым.
Такая на планеце ты адна!
Найперш цябе мяцедь нягод трывожыць,
Вітаеш ранак першая, вясну.
Найболшш дабра ў скарбонку нашу ложыш,
Найменей маеш адпачынку, сну.
Пустэльнымі былі б зямлі абшары
Без голасу твайго, красы вачэй.
І не здзяйсняліся б мужчынаў мары:
Абняць цябе, прыціснуць да грудзей.
З табою жыць і сябраваць нам міла.
Усім хапае шчырасці, цяпла.
Сыноў, дачок на радасць ты радзіла.
Сабе турбот найболей адвяла.
І дом, і сад – усё, што прытуліла
Тваю сям’ю, надзейна беражэш.
Са зброяй у руках у бой хадзіла,
І ў будны дзень папераду ідзеш.
Твая любоў прымаецца ўсім сэрцам,
Тваіх заслуг нябачны берагі.
У лес бяжыш па ягады з вядзерцам,
Пасля за руль, дарога, рычагі.
І не адходзіць з памяці імкненне
Любіць жыццё за тое, што ёсць ты.
І не знікае мілае імгненне:
З табой палёт заўсёды малады!

## ПАКЛАНЕННЕ ТАЛЕНТУ

*В.Ф. Гіруць-Русакевіч*

Люблю глядзець я вечарамі
На зоркі жнівеньскіх нябёс.
Такі прасцяг ляжыць між намі –
А нечым нас яднае лёс.
І вось на нейкую хвіліну
Мяне сустрэў адзін пагляд.
Пазнаў у ім я Валянціну,
Імгненню зорнаму быў рад.
І вось адно замілаванне –
Чытаць радкі чароўных слоў.
На радасць прыбяжыць каханне
З гарачым пацалункам зноў.
Шмат прыгажосці, добрай волі
Высвечваюць старонкі кніг.
І не забудуцца ніколі
Малюнкі вобразаў жывых.
Прайшлі гады, збылася мара.
А летуценні вабяць зноў
У творчы пошук юбіляра.
Шмат у паэта згадак, сноў!

**ПАМЯЦЬ**

*Памяці брата А. Рафаловіча*

І плакалі дрэвы журботы імглою,
Напеў ручаёў гарадоцкіх прыціх.
Аббег вецер хаты з ліхой навіною
Якая кранула тых, хто йшчэ ў жывых.
Хто з болеем праводзіў да вечнай магілы
Найлепшага сябра, з кім смутак дзяліў,
Ці маці, ці бацьку, хто быў саамы мілы
Сям'і, добрым людзям пакут не прасіў.
І ўжо не патрэбна памерлым нічога:
Ні ласкі душэўнай, нігор залатых.
Тры жмені пясочку, ад слёзаў сырога:
Такія ўжо праху дарункі жывых.
Душа адляцела ў нябесныя далі,
А памяць жыве вечна ў сэрцах жывых.
Яе нам вякі ад дзядоў перадалі,
А мы зберажом для нашчадкаў сваіх.

**СЯСТРЫ ЛІДЗІІ АСТАПОВІЧ**

Ты прыйшла ў свет бойкаю жанчынай,
Шосты я, менш радасці прынёс.
А пакуль еў бацькаў хлеб з мяккінай
Зведала ты ласку, горыч слёз.
У пятнаццаць – сілай упраўляла
Коньскай, закідала цяжкі плуг.
Бесклапотна дзетвара гуляла,
Ты ж у працы гартавала дух.
Куляй на парозе роднай хаты
У вайну падкошана была.
Над табою плакалі дзяўчаты,
Прыклад мужнасці ты падала.
У табе гарыць агонь і сёння,
Старасць не залье яго ніяк:
Ты жывеш на аптымізму ўлонні,
Па сучаснаму, бадзёра так.
На двары тваім, дзе квецень саду,
Хочацца суседзям пасядзець,
Атрымаць разумную параду,
Ад якой ёсць шанец і падабрэць.

## СЯБРАМ

Цяпло ў нашы душы,
Святло ў нашы хаты
Прыносце заўсёды, дзе б вы не былі.
У будні працуйце, спявайце ж у святы,
Каб нашы матулі шчасліва жылі!

Нявестам і сёстрам
Букеты дарыце,
Шануйце іх годнасць, цалуйце часцей,
Ад смутку і крыўды заўжды беражыце,
Каб слёзы не капалі з добрых вачэй!

## ЮБІЛЯРУ

Табою ўжо дзесяткі год пражыты.
А справы важныя не адышлі.
Твайму імкненню шлях заўжды адкрыты,
Да рук праблемы новыя прыйшлі.
Хай лёс твае старанні ўсё мацуе!
Хай не спыняецца да зор палёт!
Хай родны край твой звонкі голас чуе
І кожны новы дзень і безліч год!

## ЗЯМНАЯ ЗОРКА

Маці – гэта сонейка святло,
З мілым сэрцам, ласкавай душой.
У вачах яе праменіцца цяпло,
Нават цяжкай у жыцці парой.

Носім Маці ў сэрцы, як вясну.
З ёй шчаслівыя праходзяць дні.
Любім наймацней яе адну.
Маці – гэта нашы карані.

Не ўзвышае Маці гонар свой.
Дзеліцца сумленнем заўсягды.
Дзікаю, балючаю парой
На сябе кладзе зашмат бяды.

Не бывае зорна ўсё ў жыцці.
Розныя хвіліны ў дом бягуць.
Трэба ж нам любові шмат знайсці.
Боль ад сэрца Маці адпугнуць.

Лёсам дадзена ёй старасць замяніць
На жывую квецень немаўлят,
Кроў сваю нанова абнавіць.
Не вярнуць душы, шкада, назад.

## БУДЗЕМ МАЛАДЫМІ

Не спыняюцца хвалі марскія,
І праходзяць імкліва гады.
Адыходзяць ад нас дарагія
Дні народзін і час малады.
Не старэюць ні сонца, ні неба.
Маладзіцца, красуе зямля.
З імі нам маладымі быць трэба
Кожны дзень, кожны год і пасля.
Адставаць ад жыцця нам не варта.
Важна поруч ісці, абганяць.
Толькі ўперадзе водар гаючы:
Самы дзейны жывы кісларод.
Акрыляецца там невідучы,
Робіць верны для славы палёт.

## ВОЛЬНЫ ВЕЦЕР

Лашчыцца са мной гулліва.
Я люблю яго прысвіст.
Як дыхне – увысь імкліва
Узлятае жоўты ліст.
Мала мае адпачынку,
Хоча ўсюды пабываць:
Вербаў расчасаць галінкі,
Роўнядзь мора ўсхваляваць.
Вольны вецер не адужаць,
Не спыніць і не скарыць.
З ім сняжынкі ў згодзе кружаць,
З ім агонь ярчэй гарыць.

***

Бягуць бясконца цягнікі
Туды й назад штодзень, штогод…
Майго жыцця рух не такі,
Зрабіць не можа разварот.
Яно аднойчы прабяжыць
І згасне след у пустаце.
Хвіліны будуць тыя жыць
Якія Бог мне адвядзе.

## ДУШОЙ СТАРЭЦЬ НЕ МАЮ ЧАСУ

Маё жыццё, як плынь ракі,
Было ўстрывожана вірамі.
Хоць лёс і быў круты такі:
Ззяў трохі зорнымі гадамі.
Дарогі клічуць, вышыня,
Адмовіць ім я не жадаю.
У працы цешуся штодня,
І ў думках за крайсвет блукаю.
Спеў у жыцці дабро тварыць,
Душой старэць не маю  часу:
Хачу я змараю пабыць
Тваёй і помніць стрэчу нашу.

** *

З вытокаў далёкіх штодня
Са звонам бягуць ручаіны…
І водгукам тайным жыцця
Гісторыі вабяць сцяжыны.

**ЖАДАННЕ**

Шчасце я шукаю ў свеце белым.
Прытаміўся марыць і блукаць.
Не жадаю быць незразумелым,
Толькі роспач, смутак сустракаць.
Ці ў вясну лячу, дык сам не знаю,
Квецень бачу тую толькі ў сне.
Далеч кліча, смэрцам адчуваю,
Гэта тое, што патрэбна мне.
На душы ў мяне крыху самотна.
Часу хуткацечнасць не суняць.
Дні ляцяць чародкай бесклапотнай,
Іх жа трэба нечым напаўняць.

## ЖЫЦЦЯ ДАРУНАК

Прыносіць лёс сюрпрызы нечакана.
Ад крыўды выльецца сляза з вачэй.
… І ўжо журбы загойваецца рана
І недзе ў думках робіцца лягчэй.
Не абыйсці нам вызначанай сцежкі,
Нялёгка шлях цярністы абмінуць…
Хаваемся пад радасці застрэшкі.
Пакуты сілімся з сябе спіхнуць.
Не можам быць шчаслівымі зашсёды.
Надзеі зноў гайдае нас прыбой.
Жыцця дарунак сціплы ад прыроды,
І кожнаму даецца толькі свой.

## ПАХ ХЛЕБА

Люблю ў святочны час прайсціся
Там, за ваколіцай вясковай.
Зярняткі сокам наліліся
І звоняць спеласцю васковай.
Над нівай хлеба пах струменіць,
Таго, што днём на сонцы пёкся.
Нішто яго мне не заменіць,
Ніхто ад хлеба не адрокся.
Шуміць калоссем жнівень спелы,
Дажджамі цёплымі абмыты.
І ветрык лёгкі, загарэлы
Гайдаецца на хвалях жыта.

**МЫ ТАКІЯ**

Вельмі розныя мы ўсе.
А чаму? Хто растлумачыць?
Нехта больш і больш пяе,
А другі ўсё болей плача.
Нехта мае грошай шмат
Ды яшчэ прыдбаць хітруе,
А другі капейцы рад,
Аб раскошы не бядуе.
Іншы можа адабраць
Грош ад маці, пасварыцца
Ці скарынкай заўладаць
І ні з кім не падзяліцца.
У каго гасціннасць ёсць –
Прыме з ласкай, пачастуе.
А другі ўсё тоіць злосць,
Ганьбу, здзек другім рыхтуе.
Нехта хуценька памрэ,
Нечакана і без гуку –
Некага смерць не бярэ,
Як не зведаў болю мукаў.

## НЕСПАКОЙНАЕ СЭРЦА

Мацую волю я і сілы –
Над бурай хочацца ляцець.
Не абламаць мае ёй крылы,
Змагацца буду  і дужэць.
У чорных хмарах навальніцы
Знаходжу ўцеху часта я.
У бляску яркай бліскавіцы
Шукае гарт душа мая.
Ляжаць не буду я скалою,
Дзе хвалі коцяцца, бурляць.
Успыхну яркаю зарою
Для тых, хто йдзе дабро шукаць.
Над прорвай жудкай на хвіліну
Здзіўлюся і пабачу зноў,
Як дрэва роднага галіны
Ва ўсім згаджаюцца са мной.

## ТЫТУНЁВАЯ АТРУТА

Эх, дзяўчаткі, кветкі-рунь!
Паглядзець на вас так міла!
Ды чаму ж гэта тытунь
Каля вас дыміць кадзілам?
Добрай модай стала вам
Тытунёвая атрута.
Шкода дочак, шкода мам –
Тытуню іх ціснуць путы

## ЧАЛАВЕК

Чалавек – гэта волат прыроды.
Ён надзейны ахоўнік яе.
Абаронца дабра і свабоды,
А дзе трэба – жыццё аддае.

Шмат працуе, дабра шмат стварае,
Не хапае чагосьці ж яшчэ.
Сілы цёмныя ён разбурае,
Больш святла ў сэрцы нашы цячэ.

Чалавек – розум, цуда планеты,
Што завецца матуляй Зямлёй.
Вечным сонцам яна абагрэта,
Бы дзіця, яе носіць з сабой.

## УСПАМІН

Як пабачыў твае вочы,
Тваю радасную ўсмешку,
За табой, як цень пакрочыў,
На сваю забыўся сцежку.
Мы пайшлі кудысьці ў восень,
Нас вятрамі падганяла…
І адразу мне здалося,
Што маім ты шчасцем стала.
Што было б, падумаць страшна,
Каб мой сум ты не адчула.
Можа б роспач безразважна
У раку мяне штурхнула.

## НЕПАЎТОРНЫ ТОЙ ВЕЧАР

Я хаджу каля рэчкі, блукаю.
Пад вярбой пастаю, пад журбой.
І ўсё даўні той вечар шукаю,
Што згубілі калісьці з табой.
Як жа ўбачыць той вечар пунсовы?
Што свяціўся на твары тваім?
Сумна вербы стаяць, вечарова,
А, здаецца, што мы тут стаім.
Дзе ты блудзіш, святое імгненне?
Я табою ўсё цешу душу.
І хаджу, і маўчу ў задуменні,
І трывожна гляджу на шашу.

## ВОСЕНЬ

Восень маладзіцай прыбіраецца.
Лёгкім лісцем любіць пакружыць.
То далёка сонцам усміхаецца,
То раптоўна бурай набяжыць.
Павуціну, як струну нацягвае
Ветрык ціха брынкае на ёй.
Тонкая мелодыя прыцягвае,
Абуджае сцішаны настрой.
Зноўку лёгкім лісцем рассыпаецца,
Жалудамі падае з дубоў.
Толькі рэхам сумным адгукаецца
Даўняя, далёкая любоў.

## БУКЕТ

*І прыбяжыць к табе каханне…*

Самы яркі букет для мяне –
Гэта дар спелых ніў і садоў.
Падарыць людзям хочацца мне
Слодыч песень, шмат ласкавых слоў.
Я збіраю ўсе краскі ў букет
І зімовай, і летняй парой.
Хай жа ведае ўвесь інтэрнэт,
Што дару іх Айчыне сваёй!
Як сумую – абходжу гаі.
Гладзіць косы бярозаў хачу.
Ім спяваюць вясной салаўі.
Аб любові сваёй я шапчу!
Самы першы букет падарыў
На зары я матулі сваёй:
Слова “мама” за ёй паўтарыў,
Адказала: “Сынок мілы мой!”

## БУДЗЬ ШЧАСЛІВАЙ

Я захапляюсь зоркамі ўначы –
Тайнамі вабяць душу.
Сэрца спаткання з табой маё хоча,
Будз ты шчаслівай, прашу!
Дзе я ні буду, твой голас пачую,
Межаў да любай няма.
Палкім каханнем цябе я ўсхвалюю,
Будзеш хварэць ім сама.
Часта гляджу я на зоркі маркотна,
Сумна блукаць ім адным…
Ты да мяне прыгарніся пяшчотна,
Стану табе дарагім.
Ты для мяне – з дзіўнай казкі багіня,
Шчыраму слову павер!
Шчасце са мною тваё не загіне,
Лёс свой навек мне давер!

## ЛЯСНЫ ВОЛАТ

Адшукаў мясціну
Я ў бары грыбную,
Абышоў яліну,
Вось і ён, вясёлы,
Цуд усё ж бывае –
Баравік, як волат,
з моху паглядае.
Радасць у паглядзе,
Не чакаў такога,
Ледзь у кош прыладзіў
Волата грыбнога.
Праз паляны, долы
Ціха сцежка ўецца.
А ў кашы вясёлы
Баравік смяецца.

## МАРЫ ПРАДВЕСНЯ

Лютасць адыдзе траскучых маразоў,
Рэкі зазвоняць крыштальным ільдом.
Сок запульсуе ў галінках бярозаў,
Рунь абагрэюць праменні цяплом.
Пушчы пралескамі птушак спаткаюць,
Песняй павісне над полем жаўрук.
Зноў перуны над зямлёй загукаюць,
З фарбаў змайструе вясёлка свой лук.
Зернем засеюць руплівцы палеткі,
Зменіць прырода зімовы фасон,
Луг размалююць цудоўныя кветкі,
Працу аддам я вясне, свой паклон.

## НАПРЫКАНЦЫ ЛЕТА

З лугоў вазілі кветак пах
У пуні разам з мурагамі.
Плывуць камбайны па жытах,
Кладуцца скібы за плугамі.
Мякінай лёгкай збажыны
Над пожняю віхрыцца жнівень.
Раскалыхалі бацяны
Аблокі лёгкія над нівай.
На бэльцы зноў вісіць каса.
Больш на рамонку не варожаць.
Пяе трывожна страказа
Пра тое, што й цябе трывожыць.

## ПОДЫХ ЗІМЫ

Гулка трубіць, завывае
Завіруха нездарма.
Так па свойму нас вітае
Неспадзеўная зіма.
Кветкі, хоць і ледзяныя,
Ложыць нам на шкло акон,
Без іголкі футры шые,
Тчэ палотны без красён.
Ходзім шпарка ў час зімовы,
Шчокі ружамі гарачь.
Як пакрые іней бровы
Дык мароз – на дваццаць пяць.

## СІНІЧКА

Мароз пад стрэхі з эскам лезе.
Ты не зважаеш на мароз,
Вядзеш радок слядоў па снезе
Ля родных сосен і бяроз.
Зноў бор у белае абнове.
Дзень роўна, як і след, бяжыць.
Ты пад маім акном зімовым
Даўно ўжо звыклася кружыць.
Спяваеш звонка – смутак гоніш,
І неба свеціцца ў вачах.
Не носіш крыўды і не стогнеш,
Не знаеш, што такое страх.
Не маеш цёплайц ты пасцелі,
Твой дом – застрэшак, крона дрэў.
На поўдзень птушкі адляцуцелі,
Цябе айчынны дах прыгрэў.
Бацькоўскі кут заўсёды мілы,
А той не радуе, чужы.
Маленькая, а колькі сілы,
Любві мужнасці ў душы!

## СЕЛЯНІН

Ты ў вечным руху, селянін,
Мазоль – твая прыкмета.
Бывае, што ясі ты блін,
У спешцы падагрэты.
Трывожышся каб не праспаць
Маўклівае світанне.
Што сеяць, дзе, з чаго пачаць?
Адно ў цябе пытанне.
На вагі золатам кладзеш
Хвіліны ў час работы,
Палеткам першы покліч шлеш
Пасля начной дрымоты.
Нібыта дзетак, каласы
Ты гладзіш залатыя.
Кудлаціць вецер валасы
Штодзень твае льняныя.
Табе спявае птушак хор,
Шле дожджык прахалоду,
І маладзее ўвесь прастор,
Ты адчуваеш асалоду.

## ХЛЕБАРОБ

Усё жыццё не разгінаўся,
На ніве працу паважаў.
І на сяброў не аглядаўся,
Насмешак іх не заўважаў.
І не стамляўся аніколі,
За плугам цешыўся зарой.
Знаходзіў шчасце сваё ў полі,
Там сустракаўся ён з вясной.
Ды што яму да той пашаны,
Да славы, што не ў навіну?!
Ён устае на золку рана
І цягне ў вечнасць баразну.

## ВОДАР САДОВЫ

Павітаў жыццё я ў вёсцы
Першым гукам немаўля.
Радасна было бярозцы,
Што на свет з’явіўся я.
Тут ля хат і ля сцяжынак
Пахнуць квеценню сады.
Да марозаў, да сняжынак
Спелыя звіняць плады.
Вёскі шумныя прысады
Нібы сцэны спевакоў.
Паспяваць тут птушкі рады.
Шмат прыемных галасоў.
Дзе ні глянь – прыроды чары,
Сэрцу мілыя яны.
І плывуць да зораў мары,
Вабяць хвалі збажыны.

***

Калі заціхлі ў кронах песні,
Ствалы звінелі – быў мароз.
Убранне снежнае прынеслі
Віхуры для дубоў, бяроз…
Быў дзень той казачна-урачысты,
Я з ранку ў лесе гасцяваў.
У пінжаку сваім квяцістым
Штось дзяцел гулка адбіваў.
Ад нейкай радаснай пацехі
Кружыўся снег сярод ялін.
Вавёрка лускала арэхі,
Лось смакаваў кару асін…

Нясу я ў лес любоў, шмат ласкі,
Вяртаюся як з дзіўнай казкі.

**ЗМЕСТ**


РАДЗІМА НЕЎМІРУЧАЯ
БЕЛАРУСЬ
РАДЗІМА
ПАРОГ БАЦЬКОЎСКІ
МАТЧЫНА ВОЛЯ
ДЗЕ ТАК ВОЛЬНА
ДАРАГОЕ
БЯРОЗЫ
БЕЛАРУСЫ
МОВА РОДНАЯ
БЕЛАРУСЬ ПАРТЫЗАНСКАЯ
МАЛАДЫМ УДОВАМ
САЛДАТ
СКАЗ ПРА ДОРЫ
АЎТАМАТЫ НА ГРУДЗЯХ
НАПЕВЫ ЖАНЧЫНЕ
ГАДЫ БЯГУЦЬ
МЫ СЛАВІМ ВАС, ГАЗАВІКІ!
ВАЛЯНЦІНА
БЫЛО І СВЯТА
БЫЛЫМ НАСТАЎНІКАМ
ЖАНЧЫНАМ
ВОСЕНЬСКІ МАТЫЎ
ЖАНЧЫНА ЗАСЛУГОЎВАЕ ЛЮБОЎ
ОДА ЖАНЧЫНЕ
ПАКЛАНЕННЕ ТАЛЕНТУ
ПАМЯЦЬ
СЯСТРЫ ЛІДЗІІ АСТАПОВІЧ
СЯБРАМ
ЮБІЛЯРУ
ЗЯМНАЯ ЗОРКА
БУДЗЕМ МАЛАДЫМІ
ВОЛЬНЫ ВЕЦЕР

***Бягуць бясконца цягнікі...
ДУШОЙ СТАРЭЦЬ НЕ МАЮ ЧАСУ
***З вытокаў далёкіх штодня...
ЖАДАННЕ
ЖЫЦЦЯ ДАРУНАК
ПАХ ХЛЕБА
МЫ ТАКІЯ
НЕСПАКОЙНАЕ СЭРЦА
ТЫТУНЁВАЯ АТРУТА
ЧАЛАВЕК
УСПАМІН
НЕПАЎТОРНЫ ТОЙ ВЕЧАР
ВОСЕНЬ
БУКЕТ
БУДЗЬ ШЧАСЛІВАЙ
ЛЯСНЫ ВОЛАТ
МАРЫ ПРАДВЕСНЯ
НАПРЫКАНЦЫ ЛЕТА
ПОДЫХ ЗІМЫ
СІНІЧКА
СЕЛЯНІН
ХЛЕБАРОБ
ВОДАР САДОВЫ
***Калі заціхлі ў кронах песні...

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**ЗЯЛКОЎСКІ Яўген Фаміч**

# УЗОРЫ ЖЫЦЦЯ

Вершы

Рэдактар
*Н. І. Мельнічэнка*

Дызайн вокладкі
і камп'ютарная вёрстка
*Л. У. Гатавіцкая*

ГА "Мінскае абласное аддзяленне
Саюза пісьменнікаў Беларусі".
Пл. Свабоды, 13-1, 220013, г. Мінск.
Тэл./факс: 8(017) 347 08 60.
E-mail: maaspb.m@yandex.by
www.maaspb.by